Ідэі маладых

# У КРУГАСВЕТКУ — ПРАЗ «ТЭЛЕПОРТ»

**Ідэя вокамгненных перамяшчэнняў «вырасла» з мясцовага інтэрнэт-каталога. Распрацоўшчыкі — чацвёра маладых людзей з Брэста — падумалі, што напісаць каментарый пра якую-небудзь мясціну добра, але пабываць там куды цікавей. За паўгода стварылі апісанне праекта, дзе для «кругасветнага падарожжа» спатрэбіцца толькі камп'ютар і доступ у інтэрнэт. Мяркуецца, што чалавек заходзіць на сайт, выбірае краіну і атрымлівае анлайн-відэатрансляцыю з пэўнага горада. Праграма дапаможа пабываць у Маскве, зазірнуць у Мінск, паглядзець, якое надвор'е ў Берліне і скончыць падарожжа дзе-небудзь у Індыі. І ўсё гэта за некалькі гадзін. Прычым, не проста «зазірнуць у акенца», а атрымаць поўны агляд на 360 градусаў: можна павярнуцца кругом, паглядзець уверх і ўніз, а то і прашпацыраваць па вуліцы ў любы час і надвор'е — проста перамяшчаючыся ад камеры да камеры.**

За рэалізацыю брастаўчане ўзяліся хутка. Праграміст Дзяніс Дземідзюк і web-праграміст Антон Пастаялка заняліся распрацоўкай сайта, Вольга Каласоўская, менеджар па рабоце з кліентамі, прымерала на сябе ролю маркетолага і адміністратара сайта, а Антон Любахінец, менеджар праекта, стаў адначасова адказным за яго тэхнічную частку.

З электронікай і праграмаваннем брэсцкі вынаходнік знаёмы даўно. Антон сам спраўляецца і з паяльнікам, і з камп'ютарнымі кодамі. Яшчэ студэнтам БрДТУ ён прынёс на міжнародны конкурс навукова-тэхнічнай творчасці навучэнцаў Саюзнай дзяржавы «Таленты XXI стагоддзя» прыбор, які можа замяніць чалавеку з аслабленым зрокам кіёк і сабаку-павадыра. Прыстасаванне памерам і формай нагадвае наручны гадзіннік, яно ўмее вібрасігналам папярэджваць аб прадметах побач, чытае тэкст, калі навесці руку на старонку, і можа пасылаць сігнал трывогі ў службу ратавання ці родным. Праект амаль скончаны, разумная машынка пратэставаная, засталося знайсці інвестараў, якія б захацелі запусціць яе ў вытворчасць. А пакуль хлопец не сядзіць на месцы і ў самым літаральным сэнсе будуе віртуальны тэлепорты: шукае, адладжвае, дапрацоўвае анлайн-камеры і сеткавае абсталяванне. Тэорыю перамяшчэнняў у прасторы праз інтэрнэт каманда апрабуе ў Брэсце.

— Мы пакуль устанавілі 14 пастаянных анлайн-відэакамер у горадзе. Яны звычайныя, але ўжо збіраюць прагляды. З аглядам у 360 градусаў запісана некалькі ролікаў, усё відэа можна пабачыць на voblako.by, — расказвае Антон Любахінец. — За тры месяцы хочам скончыць мінімальную жыццяздольную мадэль. Гэта павінны быць 10 анлайн-відэакамер з поўным аглядам. Размешчаныя яны будуць у еўрапейскіх сталіцах і Маскве. Канешне, устанавіць некалькі сотняў відэакамер сіламі чатырох энтузіястаў нерэальна. Тым больш што для карыстальнікаў інтэрнэту прагляд відэа будзе бясплатным. У той жа час кожны горад напоўнены камерцыйнымі аб'ектамі. Мяркуецца, што камеры «Тэлепорта» будуць знаходзіцца на арэндаваных бізнесменамі будынках, а спецыяльная функцыя дазволіць прадпрымальнікам размяшчаць на арыгінальнай карцінцы рэкламу ў выглядзе дапоўненай рэальнасці, якую пагледзіць вялікая колькасць карыстальнікаў інтэрнэта.

Рэкламная інфармацыя не будзе замінаць людзям атрымліваць асалоду ад відаў, наадварот, стане дапаўняць іх і несці карысныя звесткі. Напрыклад, на Краснай плошчы вы зможаце ўбачыць віртуальнага гіда, які раскажа вам пра яе.

— Мы распытвалі нашых патэнцыйных партнёраў, і 37 працэнтаў бізнесменаў згодныя ўсталяваць камеры на арэндаваныя імі будынкі, — сцвярджае Антон. — Яшчэ мы пагаварылі з магчымымі карыстальнікамі і выйшла, што праект цікавы больш як 80 працэнтам апытаных. Нехта хоча зладзіць падарожжа і папярэдне паглядзець віды, некага цікавіць загружанасць дарог. Людзі спадзяюцца, што анлайн-відэа павысіць бяспеку ў горадзе. Некаторыя бацькі казалі, што змогуць адсачыць шлях дзяцей у школу і дамоў...

Таксама вынаходнікі задумаліся над праграмай для мабільнікаў, каб чалавек мог карыстацца тэлефонам яшчэ і як сродкам віртуальнай рэальнасці. Памясціць свой гаджэт у спецыяльную канструкцыю, падобную на акуляры, і вандраваць па свеце з «эфектам прысутнасці», не пакідаючы пры гэтым пакой. Ідэяй ужо зацікавіліся расійскія інвестары, цяпер каманда «Тэлепорта» вядзе з імі перамовы.

Магчыма, наватгодні віншаванні беларусы і расіяне змогуць перадаць адзін аднаму, памахаўшы рукой у камеру. Ва ўсякім выпадку, брэсцкія вынаходнікі на гэта спадзяюцца. А пакуль Антон з сябрамі ўдасканальвае сайт, якасць відэа і плануе новыя праекты «пра запас».

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.** *yurgel@zviazda.by*



ProFit
З Наталляй Лубнеўскай

# «ФІТАНЯШКІ» ЯК СТЫМУЛ

**Гэта пачалося, напэўна, адразу ж, як з'явілася павальная мода на фітнес. Як толькі словы «прысед», «цяга» і «складаныя вугляводы» сталі гучаць ледзь не з кожнага праса, а сацыяльныя сеткі запаланілі сэлфі з трэнажорак і фотаздымкі нізкакаларыйных сняданкаў, тыя, хто быў далёкі ад здаровага ладу жыцця, прыняліся асуджаць новае масавае захапленне. «Ну колькі можна», «Знайшлі, чым ганарыцца», «Лепш бы мазгі качалі», — раз-пораз выказваецца хто-небудзь з незадаволеных.**

Я, хоць і знаходжуся, хутчэй, па іншы бок барыкад, у чымсьці пагаджуся. Некаторыя дзяўчаты ўспрынялі гэты трэнд як яшчэ адну нагоду для самалюбавання. А фітнес-залу — як новыя дэкарацыі для фотасесій. Нафарбаваныя, з распушчанымі валасамі і без адзінай кропелькі поту, пазіруюць яны каля трэнажораў і ў раздзявальнях. І няважна, што практыкаванне выконваецца няправільна, галоўнае — удалы ракурс. Карацей, альтэрнатыва фатаграфіям у купальніках у няпляжны сезон (чаго там хаваць: фігура ў спартыўнай форме не менш эфектная, чым у бікіні).

Але што да самой моды на фітнес, то, як па мне, гэта найлепшы трэнд за апошнія гады. Бо ён не патрабуе ахвяравацы нечым дзеля часовых стандартаў прыгажосці (не бяру выпадкі, калі захапленне перарастае ў нездаровы фанатызм). Наадварот, красоўкі перасталі быць выключна спартыўным абуткам і замяняюць абцасы нават у камплекце з сукенкамі і спаднічкамі. Есці шмат (няхай і маленькімі порцыямі) не лічыцца ганебным. А на стадыён увечары прыходзяць не толькі, каб папіць піва.

У рэшце рэшт якая розніца, якім чынам папулярызаваць здаровы лад жыцця? Зрабіць гэта модным куды больш эфектыўна, чым чытаць нудныя лекцыі пра неабходнасць збалансаванага харчавання і фізічнай актыўнасці.

Вядома, дзяўчаты ў большасці запісваюцца на крос-фіт і зумбу не для таго, каб умацаваць сэрца. Мэта нумар адзін — пругкія ягадзіцы і плоскі жывот. Але ў выніку тыя, хто застаецца ў фітнесе больш чым на пару пробных трэніровак, самі пачынаюць задумвацца не толькі пра знешні эфект ад заняткаў.

Іншыя справа, што адпавядаць новай модзе не так проста. Каб быць у трэндзе, трэба пачаць працаваць над сабой. Ты б, можа, і не хацеў (хоць у глыбіні душы не надта сабой задаволены), але ж кожны дзень табе нагадваюць, як гэта проста і карысна — займацца фітнесам. Сябры посцяць у стужку скрыншоты кіламетражу, які ўдалося набегаць зранку, пішуць, колькі калорый паспелі спаліць на беганой дарожцы, і хваляцца фоткамі «пасля». Пасля гэтага заставацца ў зоне камфорту, дзе ты збіраўся дайсці да залы калі-небудзь, калі будзе час і настрой, нават неяк атрымліваецца.

Раздражняюць не самі «фітаняшкі», а ўласнае бяссілле. Вядома, прасцей абурацца на маніторам і пісаць у каментарыях, што цягаць жалеза — гэта не па-жаноцку і дзяўчаты з формамі (якія, насамрэч, ужо страцілі форму) выглядаюць куды прывабней, чым атлетычныя аматаркі спорту. Незадаволеныя новай модай пішуць, што ні ў якім разе не зайздросцяць. Сур'ёзна? Было б гэта так, вы б спакойна рэагавалі на чарговае фота з залы і рэцэпт дыетычнага пірага.

А на «фітаняшак» злавацца не трэба. І вось чаму: канадскія дыетолагі высветлілі, што падцягнутыя сябры дапамагаюць скінуць вагу. У даследаванні ўдзельнічала каля 10 тысяч чалавек. Ва ўсіх былі лішнія кілаграмы, ад якіх яны хацелі пазбавіцца. Спачатку навукоўцы апыталі валанцёраў эксперымента наконт таго, ці ёсць у іх стройныя сябры. Аказалася, што практычна ва ўсіх удзельнікаў даследавання прыяцелі таксама былі «ў целе». Але ўжо праз год у тых, хто актыўна змагаўся з лішняй вагой, з'явіўся хоць бы адзін падцягнуты сябар. Як той казаў, не можаш змяніць абставіны, змяні сваё стаўленне да іх.

Проба пярамог

# ПРЫЗАВАЯ СТАБІЛЬНАСЦЬ

**У склад беларускіх каманд, якія выступаюць на міжнародных прадметных алімпіядах, трапляюць вучні не толькі гімназій, але і звычайных, у тым ліку вясковых, школ.**

Пра гэта расказала **кансультант упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Анжэла КУДАЯРАВА**. Паводле яе слоў, сістэма нацыянальнага адбору дае магчымасць трапіць на міжнародны этап любому таленавітаму школьніку. «Напрыклад, у 2014 годзе пераможцам адной з міжнародных алімпіяд у нас стаў вучань сельскай школы з Гродзенскай вобласці», — адзначыла Анжэла Кудаярава.

Розніца ў колькасці заваяваных медалёў штогод складае не больш за адзін-два ў большы ці меншы бок. Напрыклад, сёлета з 46 міжнародных «алімпіяднікаў» 42 прывезлі ў Беларусь медалі, 5 з іх — залатыя. Галоўныя канкурэнты Беларусі ў барацьбе за прызавыя месцы лічацца Кітай, ЗША і Расія.

«Адзначу, што мы не толькі рыхтуем дзяцей да ўдзелу ў алімпіядах, але і самі праводзім спаборніцтвы такога кшталту, — дадала **галоўны спецыяліст упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Мінадукацыі Алена СЕНЧАНКА**. — Напрыклад, летась дзеці з 25 краін прыехалі да нас, каб паўдзельнічаць у Еўрапейскай матэматычнай алімпіядзе сярод дзяўчат. Права правесці ў сябе турнір мы атрымалі ў 2013 годзе, калі наша каманда дэбютавала на гэтай алімпіядзе і адразу ж здзейсніла фурор: з чатырох удзельніц тры ўзялі «золата», а адна — «серабро».



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Сярэбраны прызёр 48-й міжнароднай хімічнай алімпіяды і 50-й Мендзялееўскай алімпіяды школьнікаў па хіміі Міраслаў Макарэвіч і пераможца ў секцыі «Матэматыка» 23-й Міжнароднай канферэнцыі юных навукоўцаў па фізіцы, матэматыцы, інфарматыцы і экалогіі, бронзавая прызёрка Міжнароднага турніру юных матэматыкаў Ліяна Хазалія.**

Ці дапамагаюць школьным «алімпіяднікам» іх веды падчас вучобы ў ВНУ? **Настаўнік матэматыкі сталічнай гімназіі №41, дацэнт факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ Барыс КАМРАКОЎ** лічыць, што такія поспехі далёка на заўсёды гарантуюць бесклапотнае жыццё ва ўніверсітэце: «Так, гэтыя вучні сапраўды маюць невялікую перавагу перад астатнімі першакурснікамі. Яны ведаюць шмат таго, што важна для ўдзельнікаў алімпіяд, але могуць нават не чуць пра тое, што на спаборніцтвах не было патрэбна».

Тым не менш, большасць пераможцаў прадметных алімпіяд знаходзяць сябе ў жыцці. Сярод іх можна назваць, напрыклад, цяперашняга пасла Беларусі ў Кітаі Кірыла Рудага, кіраўніка беларускага офіса кампаніі «Яндэкс» Аляксея Сікорскага і многіх іншых. Былых «алімпіяднікаў» нярэдка прыцягваюць і да падрыхтоўкі новых пакаленняў таленавітых дзяцей, за лёсамі пераможцаў сочаць і ў раённых упраўленнях адукацыі.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

СУМЕСНЫ ПРАЕКТ
БРСМ. СКАРБОНКА ДОБРЫХ СПРАЎ. ЧЫРВОНКА

# Унёсак моладзі ў аднаўленне святыні

**У рамках рэспубліканскай дабрачыннай акцыі «Аднаўленне святынь Беларусі» штатныя работнікі Гомельскай абласной арганізацыі і актывісты БРСМ прынялі ўдзел у добраўпарадкаванні і навядзенні парадку на тэрыторыі касцёла ў Рагачове.**

— Ён мае доўгую і вельмі цікавую гісторыю. У 1783 годзе ў горадзе быў адкрыты драўляны каталіцкі храм, які насіў назву Беззаганнага Зачацця Дзевы Марыі. Цяжка сказаць, хто і калі перайменаваў яго. Магчыма, гэта быў мясцовы пробашч ксёндз Бернатовіч, чыімі намаганнямі быў узведзены новы будынак з чырвонай цэглы ў стылі неаготыкі, асвечаны летам 1912 года ў гонар Святога Антонія Падуанскага, — праводзіць гістарычны экскурс каардынатар валанцёрскага руху «Добрае Сэрца» Гомельскай абласной арганізацыі БРСМ Веранiка Ражкова.

Касцёл дзейнічаў да канца 1930-х гадоў, а пасля закрыцця перажыў шмат драматычных падзей і разбурэнняў. У розны час у яго будынку размяшчаліся зерняsклад, цэх па вытворчасці напояў і марожанага, пажарны пост і хлебазавод. Асабліва моцна пацярпела святыня ў Вялікую Айчынную: падчас баёў за вызваленне горада ў касцёл трапіла некалькі снарадаў. З 1970-х гадоў храм пуставаў, і толькі праз трыццаць гадоў будынак быў перададзены мясцовай каталіцкай парафіі. Напачатку 2000-х пачалася яго рэстаўрацыя. Работы па аднаўленні фасада старажытнага будынка вядуцца з 2003 года. Рэканструкцыя часткова была завершана да 100-годдзя асвячэння храма. Ён унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь.

Маладыя людзі, якія шчыравалі на тэрыторыі касцёла, могуць па праве ганарыцца, што зрабілі свой унёсак у аднаўленне славутай святыні рагачоўскай зямлі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*